ДУК «Навагрудская раённая бібліятэка»
Аддзел па абслугоўванні дзіцячага чытача

# Васіль Вітка

## да 105 - годдзя з дня нараджэння



Электронная выстава

Навагрудак, 2016

elenaranko.ucoz.ru

«Ён нарадзіўся пад знакам паэзіі».

Вера Палтара
літаратурны крытык

Імя Васіля Віткі – адно з самых прыкметных сярод майстроў прыгожага пісьменства Беларусі. Гэтаму паспрыяла рознабаковая творчасць пісьменніка, які надзіва ўдала праявіў сябе як паэт і празаік, драматург і перакладчык, казачнік і публіцыст, крытык, сатырык і журналіст.

elenaranko.ucoz.ru

# Біяграфічныя звесткі

Жыццёвы шлях пачаўся ў слуцкай вёсцы Еўлічы, дзе ў сялянскай сям’і 16 мая 1911 года з’явіўся на свет Цімох Васільевіч Крысько – так па - сапраўднаму звалі пісьменніка. У 1912 годзе сям’я ў пошуках лепшай долі апынулася ў Омску. У родную вёску вярнуліся адразу пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. У Еўлічах Цімох скончыў тры класы мясцовай школы, экстэрнам здаў экзамены за чацвёрты клас у суседняй сямігодцы, але далей вучыцца не давялося. Ён стаў вучыць дзяцей мясцовага хутараніна за харчы і невялікую даплату. Адначасова вучыўся ў кузні свайго суседа кавальскай справе.




elenaranko.ucoz.ru

# Біяграфічныя звесткі

Пасля заканчэння ў 1928 годзе Слуцкай прафесійна-тэхнічнай школы працаваў слесарам на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце, у заводскай шматтыражцы, рэдакцыях газет «Камуніст», «Ударнік», «Чырвоная змена», «Літаратура і мастацтва» і часопісе «Полымя рэвалюцыі».

Удзельнічаў у паходзе Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь і да самага пачатку вайны працаваў сакратаром Беластоцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў БССР. З пачатку Вялікай Айчыннай вайны – у рэдакцыі газеты «Савецкая Беларусь», а з 1942 года – у аддзеле прапаганды і агітацыі ЦК КПБ, рэдактар масавых выданняў для акупіраваных раёнаў.




elenaranko.ucoz.ru

# Біяграфічныя звесткі

Супрацоўнічаў у сатырычных часопісах «Партызанская дубінка» і «Раздавім фашысцкую гадзіну». З дня ўтварэння часопіса «Беларусь» працаваў яго адказным сакратаром, з 1948 года – намеснікам рэдактара, а з 1951 года – галоўным рэдактарам газеты «Літаратура і мастацтва». У 1957–1974 гадах – галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка». З 1974 года па 1987 год быў членам сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі кінастудыі «Беларусьфільм».



elenaranko.ucoz.ru

# Біяграфічныя звесткі

З 1996 года Васіля Віткі няма разам з намі. Але ёсць яго творы, ёсць магчымасць далучыцца да спадчыны пісьменніка – непаўторнага майстра роднага слова. У Слуцкім раёне ў гонар Васіля Віткі названа адкрытае акцыянернае таварыства «Вітка-Агра», з 2008 года штогод у маі праводзяцца Віткаўскія чытанні, яго імя прысвоена Акцябрскай базавай школе, а таксама адной з дзіцячых бібліятэк у Мінску. У 2006 годзе выйшла з друку кніга абразкоў пра Васіля Вітку, ягоны час і сяброў «Жыў на свеце дзед Васіль», якую напісалі Расціслаў Бензярук і сын пісьменніка Вісарыён Крысько.

elenaranko.ucoz.ru

# Тытулы, узнагароды і прэміі

- Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1943 года.
- Узнагароджаны: двума Ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі «Знак Пашаны», медалямі, медалём Францыска Скарыны
- Заслужаны дзеяч культуры БССР.
- Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР.
- Заслужаны дзеяч культуры Беларускай ССР.
- Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларускай ССР.
- Міжнародны Ганаровы дыплом імя Андэрсана з унясеннем у Ганаровы спіс.

elenaranko.ucoz.ru

Імя Васіля Віткі ўнесена ў спіс лепшых казачнікаў свету. «Няма большай асалоды, як пісаць для дзяцей», - казаў пісьменнік і плённа працаваў над дзіцячымі творамі. А зараз ёсць літаратурная прэмія і самаго Васіля Віткі, заснаваная рэдакцыяй «Вясёлкі». Уручаюць яе за лепшыя творы, надрукаваныя на старонках часопіса. Творы Васіля Віткі перакладзены амаль на 30 моў. На словы яго вершаў напісана некалькі песень.

elenaranko.ucoz.ru

# Васіль Вітка
# Урокі роднага слова




Заслужаны дзеяч культуры, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь і ўладальнік Ганаровага Міжнароднага дыплома імя Г. Х. Андэрсена, выдатны дзіцячы пісьменнік Васіль Вітка быў прыроджаным педагогам. Вось і гэтая кніга з літаратурнай спадчыны пісьменніка – своеасаблівы падручнік роднага слова, чароўнага, мілагучнага і шматфарбнага.

elenaranko.ucoz.ru

# Васіль Вітка
# «Дом, дзе жывуць словы»




Асаблівасць кнігі такая, што дайсці да дзяцей яна можа толькі пры дапамозе дарослых - бацькоў, выхавацеляў і настаўнікаў.

«Дом, дзе жывуць словы» - гэта слоўнік у вершаванай форме, складзены з багацяў народнай творчасці. Авалодаць мовай, дасканаласцю слова можна толькі, калі яно гучыць у дзіцяці на слыху, як музыка, вабіць і дзівіць чарадзействам усей сваей сілы і хараства.

Ці ёсць яна, дзіцячая мова? - пытаецца паэт. І адказвае: ёсць, адначасова шкадуючы, што гэтай мовао мала цікавяцца дарослыя.

elenaranko.ucoz.ru

# Васіль Вітка
# «Чытанка-маляванка»




Кніга адрасавана дзецям дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту.

Ладачкі-ладкі, лічылкі, загадкі, байкі, самагудкі, жарты, перакруткі, казкі, пацешкі, вясёлыя ўсмешкі - прыемны падарунак для сумеснага чытання ўсёй сям’ёй.

elenaranko.ucoz.ru

# Васіль Вітка
# «Госці»




Кніга адрасавана дзецям малодшага школьнага ўзросту.

Праз вершаванае слова ў госці да дзяцей прыйдуць гаманлівыя, пявучыя дразды, салаў’і, івалгі, жаваранкі, шпакі і другія, зусім яшчэ не знаёмыя птушкі.

elenaranko.ucoz.ru

# Васіль Вітка
# «Сонечны чараўнік»




Васіль Вітка класік беларускай дзіцячай літаратуры. Яго вершы і апавяданні і сёння гучаць сучасна. Аўтар быццам суправаджае дзіця ва ўсіх яго занятках і гульнях, клапатліва падтрымлівае яго спробы самастойна спасцігаць навакольны свет.

Творчасць пісьменніка абавязкова выкліча ў маленькага чытача весёлую ўсмешку і дапаможа дарослым адказаць на сотні яго пытанняў.

elenaranko.ucoz.ru

# Васіль Вітка
# «Вавёрачына гора»




Хто зрабіў малаточак? З чаго? На чым і як прывезлі яго хворай? Ці спатрэбіўся ён вавёрачцы?

Пра ўсё гэта вы даведаецеся, калі прачытаеце казку “Вавёрачына гора”.

elenaranko.ucoz.ru

# ЧАТЫРЫ ЎРОКІ РОДНАГА СЛОВА

## Літаратурнае падарожжа па творах Васіля Віткі

**Чытальнік**:

Жыў на свеце дзед Васіль,
За плячыма мех насіў.
Дазналіся мышкі,
Што ў мяшэчку кніжкі,
Разгрызлі завязкі,
Бачаць, адно ж – казкі.
Сталі клікаць дзяцей:
-Гэй, сюды ўсе хутчэй!

**Вядучы 1**.
Добры і мудры дзед дужа патрэбны дзецям. Ён паслухае і параіць, паспагадае і дапаможа, растлумачыць і падкажа. І абароніць, і памірыць, і вясёлы гурт збярэ. Вось і сёння мы сабраліся з вамі на адну з такіх сустрэч.



**Вядучы 2**
Як добра, калі ў нашых дзяцей такі дзед ёсць, а ў нас, хто ўжо дарослы, – быў ў дзяцінстве.
Але хто ж ён, гэты дзед Васіль, якога ўсе ведаюць у нас і любяць? Чаму з яго кніжкамі так цікава і добра? І колькі ж ён напісаў кніжак?

**Вядучы 1**
Творчасць Васіля Віткі адметная і шматжанравая. Волей лёсу гэты пісьменнік: паэт, празаік, драматург, перакладчык, казачнік, публіцыст, крытык, сатырык, журналіст, педагог. Карацей і ямчэй сказаць – асоба. А што такое – асоба? Вось як адказвае на пытанне “Хто я?” аўтар:

Узяў мяне одум:
Хто я такі, адкуль родам?
І дазнацца ў мамы мусіў –
Беларус я, з Беларусі.

elenaranko.ucoz.ru

# ЧАТЫРЫ ЎРОКІ РОДНАГА СЛОВА

## Літаратурнае падарожжа па творах Васіля Віткі

**Вядучы 2**
Усе ў нас, нават самыя маленькія чытачы, ведаюць, што дзед Васіль – гэта пісьменнік Васіль Вітка. Але перад тым як стаць пісьменнікам, ён мусіў нарадзіцца. Адбылося гэта на шаснаццаты дзень мая 1911 года ў вёсцы Еўлічы, што на Случчыне.

А ў гэтым годзе 16 мая мы адзначае 100 гадоў з дня нараджэння аднаго з выдатнейшых дзіцячых пісьменнікаў нашай краіны Васіля Віткі (Цімоха Васільевіча Крысько).

**Вядучы 1**
Прыемна, што на нашу сустрэчу завіталі дзядулі і бабулі. Яны былі першымі чытачамі Віткавай “Вясёлкі”. Рады бачыць і вашых матуль і татаў, старэйшых братоў і сясцёр, бо сёння яны з разам з вамі прыгадаюць сваё маленства з “Вясёлкай”. А вы, нашы сённяшнія чытачы, даведаецеся шмат цікавага пра чарадзея мастацкага слова – Васіля Вітку.

**Вядучы 2**
Калі сабраць разам усе кніжкі Васіля Віткі, то атрымаецца цэлая бібліятэка. Але сапраўдную вядомасць ён набыў у дзіцячай літаратуры як паэт-казачнік. Ён заслужыў прызнанне і любоў дзяцей такімі казкамі як “Буслінае лета”, “Вавёрчына гора”, “Казка пра цара зубра”, “Дударык”, “ППШ”, “Азбука Васі Вясёлкіна” і інш. Усе яны раскрываюць хараство беларускай прыроды і будзяць у дзяцей фантазію і дапытлівасць.

**Вядучы 1**
Кожны пісьменнік марыць стварыць такога героя, якога б палюбіў чытач. У Васіля Віткі такі герой ёсць. Гэта шчыры, непасрэдны і дапытлівы Вася Вясёлкін. І зараз Вася Вясёлкін пастараецца стаць і вашым добрым сябрам.

*Далей мерапрыемства працягвае Вася Вясёлкін*

elenaranko.ucoz.ru

# ЧАТЫРЫ ЎРОКІ РОДНАГА СЛОВА

## Літаратурнае падарожжа па творах Васіля Віткі

**Вася Вясёлкін:**
Прывітанне, шаноўныя сябры, любіцелі падзей і прыгод, нечаканых здарэнняў, розных дзівосаў, усялякага штукавання. Усё гэта чакае вас сёння. Літаратурная спадчына Васіля Віткі – своеасаблівы падручнік роднага слова, чароўнага, мілагучнага і шматфарбнага. Яго творы вучаць любіць родную мову, дапамагаюць разабрацца ў разуменні дабра і зла, даюць незвычайныя ўрокі маральна-этычнага выхавання. Некалькі незвычайных урокаў правяду з вамі і я.

А пачнем з урока матэматыкі – вясёлай і хітрай. Вастрыце свае вушы і ўважліва ўслухоўвайцеся, лавіце галоўнае і не блытайцеся ў словах і лічбах.



Вясёлыя задачкі ад Васі Вясёлкіна
Пра панчошкі і рукавічкі
Маша коціку на ножкі
Звязала цёплыя панчошкі,
А малой сястрычцы –
Панчошкі і рукавіцы.

Колькі пар было панчох? І колькі рукавіц? (Тры пары панчох, адна пара рукавіц)

Давайце паспрабуем рашыць такую задачку:

У кожным кутку
У кожным кутку
У хаце па катку.
Кожны сядзіць,
На траіх глядзіць.
Колькі куткоў
І колькі катвоў?

Малайцы! Чатыры каткі, чатыры куткі. Цяпер яшчэ адну, такую ж лёгенькую:

На вярбіне
На вярбіне – тры галіны,
На кожнай галіне – тры апельсіны.
Колькі нарвеш –
Усе і паеш.

elenaranko.ucoz.ru

# ЧАТЫРЫ ЎРОКІ РОДНАГА СЛОВА

## Літаратурнае падарожжа па творах Васіля Віткі

Ну, колькі нарвалі і колькі з’елі? (На вярбе апельсіны не растуць)

Ага! Цяпер вы ўбачылі, што на ўроку вясёлай матэматыкі могуць быць і хітрыя задачкі. Ну што ж, давайце – вастрыце вушы:

Каза-дзераза
За тры вазы дзеразы
Купіў тата тры вазы.
А ці кожнаму вядома –
Па чым козы йшлі дадому?
(Па дарозе, па зямлі)

Давайце цяпер рашым задачку, якая называецца “Пяты”. Слухайце ўважліва.

Пяты
Чатыры салдаты
Лічылі пяты.
Далучыўся пяты:
-Залічыце мае пяты.
Падышло дваццаць
І яшчэ пятнаццаць,
Пяць сказалі: – Братцы,
Трэба разабрацца:
Сорак пят
І сорак пят –
Колькі ж нас –
Усіх салдат?
(Сорак салдат)

elenaranko.ucoz.ru

# ЧАТЫРЫ ЎРОКІ РОДНАГА СЛОВА

## Літаратурнае падарожжа па творах Васіля Віткі

**Вася Вясёлкін**



Вось бачыце, як можна падмануць адно слова: чалавек, пяты па ліку – пяты, а ў кожнага чалавека яшчэ і на нагах – пяты. Кажуць: “Бяжыць – толькі пяты мільгаюць” Колькі ў кожнага з нас пят? Дзве, або іначай – пара.

Сорак пят і сорак пят – колькі ж нас усіх салдат? Сорак. Так мы рашылі задачку пра пяты. Цяжкая задачка, але разабраліся. Добра, што не прыйшлося нам усім разувацца і лічыць пяты.

Ну, калі з такой цяжкай задачкай разабраліся, дык усе астатнія пойдуць лягчэй.

Ці бачыў хто з вас сароку? Дзе? Якая яна? Чорная, з белымі бакамі. Сарока-белабока. А хто чуў, як спявае яна? Яна не спявае? А які ў яе голас? Ну, а цяпер вам задача пра сарок:

Колькі сарок?
У нядзелю на урокі
Прыляцелі ўсе сарокі,
Бо не ведалі яны,
Што ў нядзелю выхадны.
У панядзелак на ўрок
Прыйшло сорак сарок.
А ў аўторак за буквар
Яшчэ села дваццаць пар.
Шэсцьдзесят сарачанят
Пагуляць зайшлі ў дзетсад.
Калі ў школу на занятк
Вернуцца сарачаняткі
І пасядуць за урок –
Колькі будзе усіх сарок?
(Сто сорак сарок)

elenaranko.ucoz.ru

# ЧАТЫРЫ ЎРОКІ РОДНАГА СЛОВА

## Літаратурнае падарожжа па творах Васіля Віткі

Колькі? Адказвайце поўнасцю словамі. Сто сорак сарок. Давайце ўсе разам дружна скажам: “Сто сорак сарок”. Якія тут словы, падобныя паміж сабой? Сорак і сарок. Але адно азначае лічбу, а другое – назву птушкі. Паслухайце цяпер задачку пра меншую птушку, вераб’я.

У старога вераб’я  
У старога вераб’я  
Грашавітая сям’я:  
У кожнага верабейкі  
Па чатыры капейкі.  
Зляцеліся вераб’і –  
Налічылі два рублі.  
У самога вераб’я  
Было роўна паўрубля.  
Кожнаму верабейку  
Даў стары яшчэ капейку.  
Колькі ж мае дзяцей  
Наш багаты верабей?  
(Пяцьдзесят)

Колькі хто налічыў? Так, пяцьдзесят. Нічога сабе сямейка.

Паколькі вы ўжо стаміліся, лягчэйшую задачку я пакінуў на канец урока – задачку пра краўца. Хто гэта – кравец? Што ён робіць? Дык вось: у краўца было сем метраў сукна. Кожны дзень ён адразаў па адным метры. Колькі дзён кравец рэзаў сукно? Сем! Я ведаў, што вы мне гэтак адкажаце, таму прынёс сем метраў сукна (палоску паперы, складзеную ў сем столак) і нажніцы. Хто будзе за краўца – няхай рэжа, а мы будзем лічыць, колькі дзён: адзін, два, тры, чатыры, пяць, шэсць! На сёмы дзень ужо не было чаго рэзаць. Так чаму шэсць? А таму што сёмы дзень выхадны. А ў нас з вамі таксама – ПЕРАПЫНАК. 

На перапынку дзеці самі знаёмяцца з творамі, прадстаўленымі на кніжнай выставе”Юбіляр Васіль Вітка”, якая прысвечана творчасці В. Віткі. Звініць званок і Вася Вясёлкін запрашае дзяцей на наступны урок.

elenaranko.ucoz.ru

# ЧАТЫРЫ ЎРОКІ РОДНАГА СЛОВА

## Літаратурнае падарожжа па творах Васіля Віткі

**Вася Вясёлкін**

Наступны урок – урок роднага слова. А правесці яго, як вы ўжо здагадаліся, дапамогуць нам зноў творы выдатнага пісьменніка Васіля Віткі, якія пакажуць, як радасна і цікава гуляць са словам, разумець яго значэнні, адкрываць сэнс у самім гучанні, адчуваць яго рух, выразнасць, адценні. Ёсць словы, якія хочацца бясконца паўтараць. Яны самі завучваюцца, бо гэта вясёлыя словы. Іх мы любім змалку. Гэта лічылкі. З лічылак пачынаюцца нашы гульні.

Прыводзіцца прынцып правядзення гульні і лічылка

У гульні прымаюць удзел хлопчыкі і дзяўчынкі. Выбіраецца “леў”. Пасля лічылкі “леў” дзеці разбягаюцца і “леў” павінен каго-небудзь злавіць. Каго злавіў адводзіць у



ку”, дзе злоўленыя

п іцца да канца

г

Гульня працягваецца да таго часу, пакуль “леў” не пераловіць усіх.

**Леў**

Здароў, Лёва,
Давай лапку.
Ты гатовы ісці з бабкай?
Малы Лёва хмурыць бровы,
Малы Лёва вострыць вочы,
Малы Лёва зубы точыць,
Раскрывае Лёва рот –
Р-ра-туй-ся, народ!
Раве Лёва:
– Я здар-о-вы,
Толькі я цяпер не Лёва,
Я галодны, страшны леў –
З самай раніцы не еў.

elenaranko.ucoz.ru

# ЧАТЫРЫ ЎРОКІ РОДНАГА СЛОВА

## Літаратурнае падарожжа па творах Васіля Віткі

**Вася Вясёлкін**

А зараз пагуляем у словы. Ведаць мову, валодаць словам, складна гаварыць – усе гэтыя выразы мы часта чуем, але не вельмі удумваемся ў іх сэнс.

Часта кажуць, што нібыта галоўны прынцып беларускай граматы – як гаворыцца, так і пішацца. Выходзіць, самая лёгкая ў свеце наша мова? Як сказаў, так і напішы. Як напісаў, так і прачытай. Паспрабуем і мы з вамі справіцца з такім заданнем.

**Заданне ад Васі Вясёлкіна**

Вася Вясёлкін раздае дзецям лісткі, дзе напісаны словы, пачутыя на слых, і мабыць вымаўленне няправільна. Дзеці павінны справіць памылкі: хвігура, фуліган, фамут, хлот, целевізар, целефон, цеатр, целеграма, цемпература, ліцература і г.д.

Звініць званок на ПЕРАПЫНАК.



Дзеці працягваюць знаёміцца з кнігамі най выставы. Вася Вясёлкін запрашае на наступны урок – урок кемлівасці.

**Вася Вясёлкін**

Словам, як чарадзейным ключыкам, мы адкрываем самыя складаныя загадкі невядомага, словам мы адкрываем прыгажосць прыроды і прыгажосць душы чалавека, словам мы адкрываем і хараство самога слова. Ёсць словы розныя: радасныя, сумныя, вясёлыя. А ёсць словы хітрыя, вельмі хітрыя. У загадках усе словы хітрыя. І каб разгадаць іх сэнс, трэба думаць і нават бывае трэба паварушыць мазгамі і пафантазіраваць, каб уцяміць, што яны значаць.Словы вучаць нас кемлівасці, здагадлівасці. Словы вучаць нас думаць вобразамі, цэлымі карцінамі. Вучаць, памагаюць думаць вобразамі нас загадкі. Адкажыце: хто не любіць загадак? Усе любяць. Ну, так вось вам і загадка:

Малы Малышак  
Зваліўся з вышак,  
Не так пабіўся,  
Як шапачкі забыўся.



(Арэх)

elenaranko.ucoz.ru

# ЧАТЫРЫ ЎРОКІ РОДНАГА СЛОВА

## Літаратурнае падарожжа па творах Васіля Віткі

Повен хлявец
Белых авец.
Добра жывецца,
Лёгка жуецца
Дружнаму статку.
Хто засмяецца –
Скажу вам адгадку.

(Зубы)

Усе засмяяліся – усе здагадаліся. А такую загадку хто адгадае:

На палачцы – галачка,
Халодная качалачка,
Аб губачкі трэцца,
Просіцца пагрэцца.
Ты яе паліжы
І на вушка мне скажы –
Як яна завецца?

(Марожанае)

Кожны хто падняў руку, дае адказ Васі Вясёлкіну па сакрэту, толькі на вушка. Цікава, ці ўсе адгадалі загадку.

**Вася Вясёлкін**

Яшчэ адну смачную загадку вам загадаю:



Круглы, як сонца,
Шыпіць пад ім донца.
Падрумяніцца бачок –
Скоціцца на рушнічок.

(Блінец)

А хто з вас адкажа, пра якую бабулю гаворыцца ў гэтай загадцы:

Хоць бабуля злая –
Нікога не чапае.
Але кожнаму дасць здачы:
Хто пакрыўдзіць – сам заплача.

(Цыбуля)

elenaranko.ucoz.ru

# ЧАТЫРЫ ЎРОКІ РОДНАГА СЛОВА

## Літаратурнае падарожжа па творах Васіля Віткі

А пра якіх братоў гаворыцца ў загадцы “Браты”

(Чытае вучань)

Пабывалі на ўсім свеце,
Вандравалі на ракеце,
Удваіх браты не раз
Бачылі Венеру, Марс,
А сустрэцца не могуць,
Хоць жывуць цераз дарогу.

(Вочы)

А пра брата і сястру?

(Чытае вучань)

Брат сястру пабачыць рад,
Але строгі ў іх расклад:
Прачынаецца сястра –
Брату спаць ісці пара.

(Сонца і Месяц)



Не спяшайцеся з адказам. Калі адгадалі ўсе правільна – адкажыце разам, усім класам.



Званок на ПЕРАПЫНАК.. Вася Вясёлкін папярэджвае, што наступны урок – урок беларускай казкі. Каб адказаць правільна на падрыхтаваныя ім пытанні, дзеці знаёмяцца з казкамі Васіля Віткі, прадстаўленымі на кніжнай выставе.

elenaranko.ucoz.ru

# ЧАТЫРЫ ЎРОКІ РОДНАГА СЛОВА
## Літаратурнае падарожжа па творах Васіля Віткі

**Вася Вясёлкін**

А цяпер ідзём шукаць казкі Васіля Віткі, у якіх так многа розных звяроў і птушак: вавёркі, цыбаты бусел, смешнае качаня і каццяня, магутны зубр, важны індык…

Вася Вясёлкін праводзіць віктарыну па казках В. Віткі

1. Якія казкі Васля Віткі вы ведаеце?

(Вавёрчына гора", "казка пра цара зубра", "Хатка на калёсах", "Дудары", "Буслінае лета")

2. З якой казкі гэтыя словы?

Я сваё праславіў царства.
Шмат я выхадзіў бароў,
Горкіх папагрыз асінак
І таму сярод звяроў
Самы дужы стаў асілак.



("Казка пра цара Зубра")

3. Пра якога героя В. Віткі гэтыя вершаваныя радкі і з якой казкі?

Строга па гадзінніку
Жыў у ціхім доме
У густым асінніку
Добры наш знаёмы.
Ён трымаўся: распарадку
Раніцай рабіў зарадку,
На прагулку ўдзень хадзіў.
Вывесіў сабе расклад
На ўсю сценку, як плакат,
Калі хмарыла на дождж
Не хадзіў без галош,
Ад сонца ў спёку ён
Браў з сабою парасон.

(Артыст Зай, «Казка пра цара Зубра»)

4. Ці ведаеце вы, што такое ППШ?

(Птушыная пачатковая школа)

elenaranko.ucoz.ru

# ЧАТЫРЫ ЎРОКІ РОДНАГА СЛОВА

## Літаратурнае падарожжа па творах Васіля Віткі

5. Хто быў дырэктарам Птушынай пачатковай школы і каго ён вучыў?

(Дырэктар – пятух,
вучні – качкі, гусі, індык)

6. У якой казцы і хто з герояў гаворыць:

Сыночак,
Ты прывёз бы мне малаточак.
Не трудзіла б я зубкі,
Не верадзіла,
Малатком бы шкарлупкі біла.

(Вавёрачка-мама з казкі
“Вавёрчына гора”)



**Вядучы 1**

Вось і закончыўся наш апошні на сёння ўрок. Праз вусную народную творчасць, праз матчыны песні і казкі, праз мастацкю літаратуру адкрываў Васіль Вітка духоўныя скарбы сваіх папярэднікаў – людзей розных пакаленняў. І сам пакінуў нашчадкам багатую творчую спадчыну. Ушанаваны за гэта Дзяржаўнай прэміяй Беларусі і міжнародным дыпломам імя Ханса Крысціяна Андэрсена, занесены ў ганаровы спіс лепшых казачнікаў свету.

Кнігі Васіля Віткі, дарагія дзеці, гэта вашы сапраўдныя ўрокі жыцця і роднага слова!

Вывучайце, любіце і цаніце нашу беларускую мову!

elenaranko.ucoz.ru

ДУК «Навагрудская раённая бібліятэка»
Аддзел па абслугоўванні дзіцячага чытача

# Васіль Вітка

## да 105 - годдзя з дня нараджэння



Электронная выстава

Навагрудак, 2016

elenaranko.ucoz.ru